Літаратурная Гомельшчына

## *Міхась БОЛСУН*



*Паэт. Публіцыст. Перакладчык. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі і Беларускага саюза журналістаў. Выпусціў паэтычныя зборнікі «Яблыня ў фаце», «Там, дзе задумлівы Сож», «Спатканне з поўняй», «Пад сузор'ем дабрыні», дакументальную кнігу «Чачэрскі след у навуцы». Укладальнік паэтычнага зборніка «Далоні цёплыя зямлі». Лаўрэат міжнароднай прэміі Баяна, абласнога літаратурнага конкурсу імя Івана Мележа. Лаўрэат абласной літаратурнай прэміі імя К. Тураўскага, Анатоля Грачанікава. Узнагароджаны знакам СПБ «За уклад у беларускую літаратуру». Ганаровы член Саюза пісьменнікаў Беларусі. Ганаровы грамадзянін Чачэрскага раёна.*

*З цыкла «Роднае, блізкае»*

### НАВАЛЬНІЦА

Маланка ломанай іголкай
Прашыла тоўшчу цёмных хмар,
І след яе стралою тонкай
Працяў збянтэжаны абшар.

І тут жа гром заляскаў пугай,
Бы ў вёсцы раніцай пастух.
Прайшоўся вецер лесам, лугам,
Прамень у воблаках патух.

Цыбаты дождж зацокаў звонка
На стужцы шэрае шашы,
Сыпнуў, бы шротам, ён па вокнах,
Са стрэх зайгралі капяжы.

Усё мацней разгон залевы
Пад сполах часты бліскавіц.
Я слаўлю музыку і спевы,
І буйны пораў навальніц!

...Абмыты вуліцы, прасёлкі,
Лаза страсае кроплі ў Сож.
І пад тугой дугой вясёлкі
Паехаў ціха ўдалеч дождж.

### ГАРЛАЧЫК

У затоцы зялёная ціш.
Промень падае з неба гарачы.
Зачарована доўга глядзіш
На цудоўную кветку – гарлачык.

Качанём-птушанём на лісце
Прымасціўся, нібы на далоні,

Хоча ўверх, ды не можа ўзляцець –
Глыбіня сцябло цемрай палоніць.

На зялёным сядзіць ланцугу,
І цікаўны пагляд людзей ловіць,
І стракозы яго берагуць –
Шэпчуць штосьці на ціхай іх мове.

У Чырвонай ёсць кнізе радок
Пра гарлачык. І гэта трывожыць…
… Кіну ўсё і – ў Чачэрск-гарадок,
Дзе гарлачыкаў россып на Сожы.

***

Месяц зоры збірае на веча.
Ноч на лодцы яго прыплыве.
Сож малітву вячэрнюю шэпча,
Адбівае паклоны траве,
Што прыбегла вясною пагрэцца
І жыве ля гаючай вады.
Салаўі шчодра радуюць сэрца,
Льюцца спеваў каленцы-лады.
Адзінокі ліхтар жоўтай бэрай
Ля прычалу павіс угары.
Хвалі шчыра цалуюць свой бераг
Покуль барва не ўспыхне зары.
Сож тады скіне коўдру туману.
Ранак мыцца сюды прыбяжыць.
Першы промень стралою зламанай
Згубіць след у падводнай цішы.

## ЖНІЎНЫ ВЕЧАР

Ад зары ружовяцца паляны.
Цень гусцее ў сподачках лагчын.
На пярыну пульхную туману
Хутка ляжа вечар адпачыць.

Упадуць на плёсы Сожа зоркі,
Хвалі будуць срэбра іх люляць.
Правурчыць ля берага маторка,





І заціхне стомлена зямля.
Толькі крыкне кнігаўка над лугам,
Знічка ў небе рыску правядзе,
Ды шчупак хвастом ударыць глуха,
І кругі ўміг пойдуць па вадзе.

І красой нязвычнай вечаровай
Зачаруе жнівень ля ракі.
Маладзік – жаданую падкову –
Выцягнуць мне з віру рыбакі.

## ДОЖДЖ

Пад музыку вясёлую дажджу
І буркатню не злую грому
З душы змываю хутка стому,
На свет вачмі ўлюбёнымі гляджу.

Вясёлкі каляровая дуга
Ажно звініць высока ў небе.
І ніва пахне востра хлебам
І лета дух хаваецца ў стагах.

...Дажджынкі дапівае ўсмак зямля,
І зноў прадуць нябёсы промні,
Я ж кожны міг хачу запомніць,
І гэту свежасць выпіць спакваля.

## БАБІНА ЛЕТА

У вёсках водар
яблыкаў налітых.
Рыпяць ад стомы
з бульбаю вазы.
Пазычыўшы
нябеснага блакіту,
Цвітуць
ля балацянак верасы.
Лясоў асенніх
залаціцца грэбень.
Сукае ветрык
ніткі павуцін.

Клін жураўлёў
самоту сее ў небе,
І боль птушыны
ў сэрца мне ляціць.
Мой родны край,
нібы на раздарожжы:
Цяпло праменняў
п'е яшчэ зямля.
Грыбнік нясе
апенек поўны кошык,
А ноччу іней
прыпаўзе здаля.
Сябе пацешым мы
пейзажам гэтым,
Няхай у радасць будуць
нашы дні.
Бы птушкі нос,
век бабінага лета,
Ды молімся ягонай цеплыні.

**АСЕННІ МАТЫЎ**

Парк над Сожам
гарыць
кастром,
Зноў яго
запаліла восень.
Спрытна чырвань
апаўшых лістоў
Дворнікі
мётламі
косяць.
І на сцежках
растуць стажкі,
Кожны з іх –
злітак звонкага
золата.
Як барцы перад боем
цяжкім
Распаранулiся
клёны-волаты.





* * *

Зноў журбою на струнах дажджоў
Зацягнулася восені песня,
І на крылах кліны жураўлёў
Радасць цёплую ў вырай панеслі.

І звіняць звонкай меддзю лісты
Па-над сцежкамі ў вальсе апошнім,
А туман абдымае густы
Схаладнелую, рыжую пожню.

І зайздросціць кастрам пастухоў,
Дзе пахучая бульба пячэцца
Нават сонца. Яно раніцой
І не супраць само пагрэцца.

**ГРЫБНАЯ ПАРА**

Туман чапляецца за ногі
І падае ў сляды расой,
Да лесу крочу без дарогі,
Змывае ранак з твару сон.

Сінее ельнік за балотам,
А на грудках - мядзяны бор.
Душа імкне сюды з ахвотай,
У царства ціхае грыбоў.

Тут галасы без рэжысёра
Гучаць суладна дзень пры дні.
Тармозяць ногі самі скорасць,
Увага ўся - на мох, пад пні.

І не цішэюць лесу сцежкі
Аж да вячэрняе зары,
Дзе маскхалаты сыраежкі
За ноч накінулі ў бары.

Вось грыбнікі пад вобліск промняў
Лясную радасць панеслі...
І кожны ўпотайкі запомніць
Мясціны, дзе дары раслі.